**У парку лістапад**

Ветру не было амаль цэлы дзень. Ён, мусіць, недзе заблудзіўся ці, нагуяўшыся ўчора, стомлена заснуў дзе-небудзь у старой пушчы. Пад вечар стала яшчэ цішэй. Шэры халодны туман павіс над зямлёй. Ён такі густы, нібы хто сабраў туманы з усяго свету і пусціў іх сюды. Відаць, як у святле ліхтароў мігцяць мільёны малюсенькіх празрыстых кропелек-расінак. Ідзеш, а яны пераліваюцца, мітусяцца, нібы збіраюцца ў вясёлку.

У парку лістапад. Дрэвы стаяць маўклівыя, сонныя, з іх злятаюць пажоўклыя лісты: настаў час. Абарвецца ліст, зашамаціць лагодна і мякка, нібы развітваецца з тымі, што застаюцца вісець. Калі зачэпіць суседа, то ўжо ападаюць удвух. Так бывае: ліст за ліст чапляецца, чапляецца — і на зямлю ўжо сыплецца жоўтая замець. Слухаеш шоргат лісця, і становіцца сумна. Шкада сонечнага лета, прыемнага цяпла. (127 слоў)

**Жураўліная песня**

У радасці свая вясна, і неабавязкова ёй прыходзіць да чалавека вясной. Ёсць лета і зіма, ёсць дзень і ноч, усход і заход сонца. Зімою трашчыць уночы на рэках лёд, гул ідзе высока, а раніцай ляжаць снягі, ружовыя і чыстыя, як радасць. А ў жытнёвае лета вісіць над зямлёю яблык, пераспелы і светлы, як даўняя журба. Яблык упадзе — надыдзе восень, а восенню хлапчукі пякуць на полі бульбу, і ўвосень прыходзяць да чалавека ўспаміны пра маленства. Але толькі вясною высока ў небе клічуць радасць жураўлі. У сакавіку,здараецца, ноччу ідзе дождж, і ў вадасцёчнай трубе грыміць, як гром, абвальваецца намёрзлы лёд.

У сакавіку першым дажджом і вільготным пругкім ветрам гукае ў акно ранняя вясна. І потым ужо будуць трубіць жураўлі, а яшчэ потым ралля ў полі стане шэрай, як жураўлінае крыло.

Ляціце, жураўлі, ляціце сваёй млечнай дарогай, вясёлай і шумнай, бы крыгаход! (142 словы)

**Свет матулі**

Свет матулі. Ён бясконцы, ён таямнічы сваёй неабдымнасцю, ён з намі назаўсёды, да апошняга ўздыху. Гэты свет — наша свядомасць, наша радасць і туга, наша спадчына. Ты вырас, ты самастойны, як здаецца табе. Колькі ўрачоў ні будуць абслухваць цябе, але ніхто з іх, ніводзін з іх з такой дакладнасцю не вызначыць ні тэмпературы тваёй, ні пульсу твайго, ні біцця

сэрца, што ўпершыню ўзварухнулася пад матчыным сэрцам, як маці твая. Яна зробіць гэта ў імгненне, толькі прыклаўшы руку сваю да твайго лба і толькі вуха прытуліўшы да грудзей тваіх.

Універсітэты і акадэміі будуць вучыць цябе роднай мове, але калі не ўспрыняў мову гэтую з матчыных вуснаў, з першакрыніцы, ніколі ты адчуваць не будзеш слова, дзе гук кожны ад матулі. Мова родная таму і завецца матчынай. (125 слоў)